Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 37 (83)

Этнаскарбонка


Крамянец, Лагойскі раён. Святы, ці Дажджбогаў камень, які, каб не было засухі, падымалі 9 або 12 удовых жанчын.


Сянежыцы, Навагрудскі раён. Камень са слядамі Божай Маці і чорта, ад якога яна ўцякала.

# ВАНДРОЎКІ Ў ЗАЧАРАВАНЫ СВЕТ

## Сляды паганства захаваліся амаль у кожным раёне Беларусі

**ЯШЧЭ зусім нядаўна падчас засух у некаторых беларускіх вёсачках людзі хадзілі да камянёў па дождж, для таго іх трэба было толькі крыху падняць, калі ж камень убраць цалкам, можа пачацца патоп. Уяўленне пра камяні і дрэвы, пад якімі хавалася сусветная вада, вельмі старажытныя, пра гэта людзі гаварылі яшчэ задоўга да таго, як стаў вядомы сюжэт з Біблії пра Ноеў каўчэг.**

«Хрысціянства ўвабрала шмат старажытных уяўленняў. І ідэя сусветнага патопу прысутнічае ў вераваннях шмат якіх народаў. Нашы людзі, напрыклад, да гэтага часу распавядаюць пра крыніцы, якія перасохлі, што іх нейкая чараўніца прыкрыла патэльняй, бавоўнай, камянём, і калі той камень убраць, пойдзе вада і затопіць увесь свет, — расказвае **выканаўчы дырэктар гістарычнага цэнтра «Явар» даследчык традыцыйнай спадчыны беларусаў Ірына КЛІМКОВІЧ.** — Міфалагічная сістэма, што была да хрысціянства, — гэта недаследаваны скарб. Сёння мы можам уявіць асобныя фрагменты з яе, а існавала цэлая карціна, жыццё нашых продкаў было ўладкавана па пэўных законах, усяму быў нададзены сэнс. Людзі ведалі, што трэба рабіць, каб жыць у саўладдзі як з іншымі людзьмі, так і з усім светам. Легенды і паданні, што мы запісваем цяпер, калі падарожнічаем па Беларусі, — гэта не проста прыгожыя казкі. Калі яны перадаваліся з вуснаў у вусны на працягу стагоддзяў, а то і тысячагоддзяў, жывілі людзей, значыць нешта ў іх было. Калі атрымаецца разгадаць тую старажытную карціну свету нашых продкаў, магчыма, можна будзе зразумець наш народ, знайсці нашу нацыянальную ідэю».

Ужо на працягу 10 гадоў на энтузіясцкіх пачатках «Явар» (а гэта не толькі навукоўцы, але і людзі, якім проста цікава наша духоўная спадчына) шукае па Беларусі чароўныя мясціны і легенды з імі звязаныя. Вынік падарожжаў -- падрыхтавана да друку кніга «Сакральная геаграфія Беларусі, або Міфалогія беларускага ландшафту», дзе будуць апісаны культавыя ўзгоркі, азёры, рэкі, балоты, крыніцы, камяні, дрэвы, пячоры, лагчыны, яры, рэшткі старажытных паселішчаў, курганы, старыя могільнікі, дарогі і масты. Аўтары спрабуюць абагульніць плён назіранняў і даследаванняў, зробленых падчас прафесійных археалагічных раскопак, этнаграфічных і фальклорных экспедыцый. У кнізе сабраны тыповыя легенды. Даволі часта ў розных мясцінах сустракаюцца адны і тыя ж сюжэты, розніца толькі ў асобных дэталях. Калі нават прасочваць толькі тое як распаўсюджаны пэўныя міфы, можна ўжо рабіць пэўныя згадкі пра тое, як рассяляўся наш народ і што яго звязвала з іншымі этнасамі. Але беларусы на свой ландшафт прыдумалі свае легенды, растлумачылі, адкуль гэта ўзялося, пабудавалі сваю сістэму светапогляду».

### Ішла Божая маці па зямлі

Амаль ці не ў кожным раёне падчас вандровак «Явара» адкрываюцца «чароўныя» мясціны. Пра некаторыя з іх легенды ўжо не захаваліся, ёсць толькі згадкі ў гістарычных крыніцах, альбо людзі кажуць, што гэта месца святое, але не могуць патлумачыць чаму. «Што такія аб'екты ўваходзілі ў пэўную карціну свету, можна прасачыць нават па замовах. Хваробы ў замовах адсылаюцца на нейкі міфічны востраў, пад міфічны камень, дрэва. Камень у старой карціне свету быццам прыкрывае ўваход у іншы свет», — заўважае Ірына Клімковіч.

Паводле сведчанняў Адама Кіркора, яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя амаль кожны вялікі камень альбо той, што мае незвычайную форму, меў свае паданні і ўшаноўваўся. Такіх камянёў у Беларусі вядома больш за 300. Яшчэ і цяпер да многіх з іх ходзяць людзі. І носяць ім падарункі — цукеркі, грошы, велікодныя яйкі. Камяні здольныя дапамагаць людзям. Напрыклад, калі памыцца вадой, што скопліваецца ў адбітках на камянях, можна пазбавіцца ад хваробаў. Дарэчы, камяні-следавікі сустракаюцца па ўсёй Беларусі, іх вядома ля сотні. Паводле самай распаўсюджанай легенды сляды пакінула Божая Маці, што ішла ў Ерусалім. Па іншай версіі ішоў Бог, альбо хтосьці са святых, Пётр, Мікалай, Юр'я, ёсць камяні і са слядамі жывёл.

Менавіта ў Беларусі распаўсюджаны культ Божай Маці, яна ўзгадваецца часцей, чым Бог. Можа таму, што Бог больш караў, а Багародзіца была заступніцай.

Шмат у Беларусі камянёў-краўцоў, шаўцоў. Быццам у іх жыве чорт, змей, ці часам нейкі абстрактны кравец, які калі яму пакінуць грошы, пашые вопратку.

### Дзе жыве змей?

— А як так можа быць, калі нашы продкі верылі, што камяні ўтварыў чорт, чаму тады на іх сляды Божай Маці? — цікаўлюся я.

— Гэта звязана з паганскімі вераваннямі. Змей, чорт (ці ў Беларусі яшчэ кажуць Люцыпар) — гэта так бы мовіць «правапераемнік» Вялеса, які ў старажытных вераваннях адказваў за падземны свет. Але ў часы хрысціянства ён стаў успрымацца негатыўна, бо Бог павінен быць адзіным, а ўсё астатняе — гэта нячысцікі, чорт. Хрысціянскі міф пра барацьбу двух пачаткаў, нябеснага і падземнага, калі святы Георгій (Юр'я) забівае цмока, пераклікаецца з больш старажытнымі ўяўленнямі. У адной з вёсак я нават пачула ад бабулькі, што Юр'я вызваляе Багародзіцу ад цмока. Часта змей выступае ў якасці жаніха. Напрыклад, у Чашніцкім раёне ёсць камень-кравец, у якім, па паданні, жыў змей, які шыў вопратку і час ад часу ператвараўся ў прыгожага хлопца, які праз возера лётаў да каханай дзяўчыны-пастушкі. Неяк ён лёг паспаць і папрасіў дзяўчыну пабудзіць яго, калі раптам на небе з'явіцца хмара (хмара — увасабленне верхняга боства — Перуна). Дзяўчына не надта яго кахала, не пабудзіла. У навальніцу змей быў смяротна паранены. Яго ніяк не маглі пахаваць, калі закопвалі, зямля разыходзілася, пачыналася залева. Тады ўпрэглі ў лапаць пеўня (зноў жа птушку, якая лічыцца Перуновай) і так нанеслі зямлі на магілу краўца. Даследчыкі, лічаць, што ў Вялеса да пары было жаночае боства (паводле адной з самых распаўсюджаных версій — багіня Мокаш). Часта камяні знаходзяцца ля вады — у балоцістых мясцінах, ля крыніц, калодзежа, ручая. Многія крыніцы б'юць з-пад каменя. У крыніц жаночы пачатак. Існуе меркаванне, што рысы жаночай багіні, парнай Вялесу, пераняла Параскева Пятніца альбо Багародзіца. Па паданнях, на крыніцах часта з'яўляецца абраз Божай Маці.

Наогул у беларускіх легендах яшчэ захавалася вельмі шмат адгалоскаў паганскага светаўспрымання. Напрыклад, у адной з вёсак Ірыне расказвалі легенду, нібыта ў гэтых мясцінах ішлі тры багародзіцы, і кожная ў свой бок. Здавалася б, чаму тры, а гэта з дахрысціянскага ўяўлення, калі багоў было шмат.

Другі вельмі распаўсюджаны сюжэт пра тое, што на нейкім узгорку царква правалілася пад зямлю, звязаны з былымі паганскімі капішчамі. Гэта сведчыць пра сутыкненне дзвюх рэлігій. Яшчэ зараз расказваюць, быццам нейкая жанчына ўбачыла крыж на тым месцы, ланцугом падчапіла і амаль што не выцягнула ўсю царкву, але раптам яе нехта спужаў — і царква зноў правалілася пад зямлю.

### Клубок светапоглядаў

Часам некаторыя старажытныя вераванні ўсплываюць, адраджаюцца, як, напрыклад, тыя ж крынічныя абрады. Ці ўсё больш ставіцца крыжоў на перакрыжаваннях у сярэдзіне вёскі ці за ёй. Праўда, цяпер гэта робіцца часта сімвалічна. А раней людзі верылі, што на перакрыжаваннях сыходзяцца розныя светы. Знахаркі хадзілі туды браць зямлю, ці выносілі выкідваць замоўленыя рэчы, хваробы. Перакрыжаванне лічылася небяспечным месцам, дзе можна было нешта дрэннае падхапіць, таму там і ставілі ахоўныя знакі.

Паганскі і хрысціянскі светапогляд спляліся цяпер у адзін клубок. У мясцінах, якія яшчэ з часоў дахрысціянства лічыліся святымі, цяпер вісяць абразы, туды ходзяць хрэсныя хады з царквы, бацюшкі праводзяць службу, асвячаюць ваду ў крыніцах і святых азёрах. Больш за тое, некаторыя цэрквы пабудаваныя на месцы былых капішчаў. Некаторыя камяні ці каменныя крыжы ляжаць ля касцёлаў, праваслаўных храмаў, альбо ў самой царкве. Напрыклад, Жыровіцкі манастыр, па паданні, пабудаваны таму, што на камяні з'явіўся абраз Божай Маці. У вёсцы Камаі Пастаўскага раёна стаіць перад касцёлам вялізны каменны крыж, пра які расказваюць, што раней гэта быў паганскі каменны ідал, і ўжо калі святары ўбачылі, што людзі не перастаюць яму пакланяцца, высеклі з яго крыж.

У савецкія часы, калі вялася барацьба з рэлігіяй, людзі не забываліся на свае святыні. Калі нельга было хадзіць у царкву, хадзілі да камянёў, крыніц, на вянчанне прыходзілі да святога дуба, на царкоўныя святы ішлі на могілкі. Яшчэ і цяпер у нас апранаюць крыжы, вешаюць на іх ручнікі. Толькі сёння людзі не ткуць, а вешаюць пакупныя рэчы, а раней гэта было палатно, вытканае сваімі рукамі (!), так рабіўся аброк у ахвяру Богу.

Са шмат якіх святых месцаў людзі імкнуцца нешта ўзяць, каб забяспечыць сабе здароўе: кару ці лісце са святога дуба, ваду з крыніц, кавалачак каменя ці каменнага крыжа. Напрыклад, на Тураўшчыне шмат каменных крыжоў стаяць у цэрквах, у адной з іх святар нават спецыяльна ножык рыхтаваў для прыхаджан, каб бабулькі, што прыйдуць у царкву, змаглі скрэбці камень.

Цяпер носяць ахвяры ў сакральныя месцы, купаюцца ў святых азёрах, каб набыць моц. Вельмі шмат з такімі мясцінамі звязана павер'яў, што яны пазбаўляюць ад хваробаў, надзяляюць моцным здароўем, выконваюць жаданні.

— Цяга да сваіх святых мясцінаў у нашага народа нязводная, таму мы і вырашылі выдаць кніжку па сакральным ландшафце і апісаць у ёй тыя аб'екты, што ёсць у Беларусі, расказаць, дзе яны знаходзяцца. (Цяпер у РВУ «Літаратура і Мастацтва» па вуліцы Захарава, 19 збіраюцца заяўкі ад усіх, хто хоча набыць яе, і ад гэтага будзе залежаць, якім накладам выйдзе кніжка), — заўважае Ірына Клімковіч. — На многіх культавых месцах адбываюцца пэўныя абрады і найбольш моцнымі, гаючымі падобныя аб'екты лічацца ў пэўныя каляндарныя святы. Даволі часта царква быццам заваёўвае гэтыя мясціны, замест старых абрадаў ладзяцца іншыя, схематычныя і паўсюль аднолькавыя культы, як тое здарылася з Палыкавіцкай крыніцай. А так могуць знікнуць многія дахрысціянскія элементы традыцыйнай народнай культуры.

Існуюць і пэўныя забароны, на некаторых культавых камянях нельга сядзець, у асобных крыніцах нельга мыць ногі, а ў некаторых святых азёрах лавіць рыбу. Нават ужо легенды, што ўзніклі за савецкім часам, пераклікаюцца з больш старажытнымі. Напрыклад, калі святы камень выкарыстаць на сваю карысць, укласці ў падмурак дома, людзей чакаюць няшчасці, хваробы. Калі ў савецкія часы разворвалі палі, трактарысты ссоўвалі святыя камяні, і тады ім пачыналі сніцца сны, альбо да іх прыходзілі духі, з патрабаваннем вярнуць камень на месца. Альбо моцныя хваробы ці смерць чакалі тых, хто засыпаў крыніцы, знішчаў святыя дрэвы.

Чароўнымі ў Беларусі могуць лічыцца ўсе незвычайныя аб'екты, напрыклад, калі з аднаго месца расце два розныя дрэвы, іх парныя галінкі маглі выкарыстоўваць у любоўнай магіі, ці калі ствол дрэва разыходзіцца, утвараючы расколіну, а вышэй зрастаецца, лічыцца, што калі пралезці праз яго, можна захаваць вернасць у каханні ці пазбавіцца ад хваробаў. У Дзятлаўскім раёне на Святой гары ўтвораны нішы з камянёў, праз якія вернікі са святаром пралазяць, каб пазбавіцца ад хваробаў. Паміж вёскамі Прынта і Паромец расце дуб, які, па паданнях, надае моц, калі пад кару пакласці кавалкі хлеба і вешаць ручнікі. Шмат у Беларусі і святых гор, адны з найбольш распаўсюджаных — паданні пра дзявочыя горы, што напэўна звязана з культам багіні Дзевы. Калі там існуе паданне пра тое, што пахавана нейкая дзяўчына, гэта можа быць сведчаннем ранейшага ахвярапрынашэння. Напрыклад, пад Маладзечнам на гары ёсць могільнік XI—XII стагоддзяў, дзе праводзіліся раскопкі, і ходзіць паданне, што дзяўчына, якая не магла выбраць паміж двума хлопцамі, які лепшы, наладзіла паміж імі спаборніцтвы. Абодва хлопцы загінулі, а ў пакаранне закапалі і саму дзяўчыну.

Ці сапраўды культавыя месцы чароўныя, даследчыца адказаць не можа. Хутчэй за ўсё, так. Магчыма за такімі аб'ектамі стаяць нейкія прыродныя фенамены, якія пакуль не вядомыя навуцы, але нашы продкі здаўна заўважылі, што менавіта ў гэтых мясцінах арганізм атрымлівае нейкае энергетычнае сілкаванне. Так, даследаванні некаторых крыніц ужо пацвердзілі, што вада там утрымлівае асабісты склад хімічных рэчываў, карысных для чалавека. Але цалкам магчыма, што існуе і свет, які чалавеку пазнаць не дадзена.


Ператок-Дубнікі, Любанскі раён. Калі праз дзіркі гэтага каменя ліюць ваду, яна становіцца гаючай.

### Навошта?

— Не толькі на творах Толкіена мусяць гадавацца нашы дзеці, — упэўнена Ірына Клімковіч. — Беларуская міфалогія не менш захапляльная, чым замежная фантастыка. Адзін з рэжысёраў нават марыць зняць фільм па нашых сюжэтах, кансультуецца з намі. Можна змадэляваць, як Багародзіца пакідае сляды на камянях, як шые камень-кравец, ці як вёскі адыходзяць пад ваду, у пакаранне за тое, што не прытулілі жабрака, пад выглядам якога падарожнічаў Бог. Толькі адна жанчына, самая бедная, пускала яго на начлег, дзялілася апошнім і Бог ратаваў яе ад пакарання, загадваў ёй сысці разам з ім, адна ўмова — не азірацца. Жанчына не вытрымлівае, азіраецца і ператвараецца ў камень. Міфалогію трэба перакладаць на мову дзяцей, уводзіць у казкі, вывучаць у школе». Па-першае, гэта наша культурная спадчына. Па-другое, яе сюжэты прывязаны да тых мясцінаў, якія побач. Па-трэцяе, за многімі міфамі стаіць мараль. Напрыклад, яна вучыць любіць навакольны свет, прыроду, паважаць продкаў. Шмат легендаў, што нельга працаваць у святы дзень, асабліва на Вялікдзень. Не выпадкова Вялікдзень святкуецца менавіта вясной — калі дзень павялічваецца, неабходна ўшанаваць боства. Так, шмат у Беларусі легендаў пра мужа і жонку, якія выйшлі працаваць у такі дзень і ператварыліся ў валуны (альбо пра аратага, што скамянеў разам з валамі), калі побач ёсць маленькі камень, гэта быццам сабака бег.

Вельмі шмат у Беларусі паданняў пра скарбы. Як правіла, яны заклятыя. Калі іх возьме чалавек, якому яны не прызначаны, яго чакаюць няшчасці, смерць. І зноў жа тут мараль — «не бяры чужое». Часам скарбы ўздымаюцца з зямлі прасушвацца, вось тады быццам бы іх можна схапіць, але зноў, калі ведаць закляцце. Легенды пра скарбы з'яўляліся не проста так, у Беларусі было шмат войнаў і людзі сапраўды шмат хавалі. Але гэта не значыць, што за кожнай такой легендай стаіць схаванае багацце. Так, у многіх мясцінах расказваюць, што ў пэўнай гары ці кургане закапаная залатая карэта. Хутчэй за ўсё, тут раней было капішча, і гэта звязана з культам сонца. Магчыма, з некаторымі аб'ектамі і былі звязаныя абрады, калі багам ахвяравалі пэўныя багацці. Напрыклад, у балотах Скандынавіі знойдзены былі залатыя рэчы, посуд, якія сюды прыносілі ў часы паганства, магчыма, штосьці падобнае было і ў нас. Расповеды ж пра скарбы Напалеона — гэта з таго разраду, што і легенды пра Карла XII, Кацярыну, Пятра ці каралеву Бону. Калі народ расказвае, што хтосьці з гэтых гістарычных асобаў спыняўся, еў ля пэўнага каменя ці дрэва, гэта не значыць, што так і было насамрэч. Проста, калі губляліся больш старажытныя легенды, але людзі яшчэ ведалі, што гэта месца сакральнае, так прасцей было разумець, чаму яно ўшаноўваецца. Але цалкам можа быць і такое, што за некаторымі легендамі хаваюцца і пэўныя старонкі гісторыі нашага народа. Так, каралеву Бону ўзгадваюць у тых мясцінах, дзе былі яе ўладанні. У легендах вычэрчваецца і Вітаўтаў шлях, Альгердаў шлях.

І калі расшыфроўваць міфы, якіх толькі сакрэтаў ні «накапаеш». Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што карціна свету, што была складзена ў паганскія часы, можа быць больш дакладнай і багатай, чым тая, па якой людзі жывуць цяпер. У старажытнасці людзі былі больш назіральнымі, яны асэнсоўвалі розныя з'явы, знаходзілі ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці, а пазнейшыя пакаленні прыдумвалі свой штучны свет. Але цяпер самая галоўная задача, пакуль яшчэ ў вёсках ёсць людзі, якія валодаюць старажытнай інфармацыяй, — захаваць яе, занатаваць. Нядаўна ў «Явара» адбылася сотая вандроўка, тут заўсёды рады новым людзям, не толькі тым, якія здольныя падказаць новыя маршруты для краязнаўчых вандровак, але і тым, хто сам хоча больш даведацца пра Беларусь чароўную.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# БЕЛАРУСКІ АПТЫМІЗМ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

## (Афарызмы)

● Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, дый непатрэбна.

**1971 г.**

*(Зямля пад белымі крыламі)*

● Роля мастацтва: яднаць усіх, нават калі яны ваявалі адзін з адным і ўдвух супраць трэцяга.

**1976 г.**

● Самая вялікая ўзнагарода, калі цябе хваляць тыя людзі, якім табе неяк не здарылася ў жыцці выпадку дапамагчы і зрабіць дабро. І самая вялікая бяда, калі цябе лае і ганьбіць той, каму тое дабро ты ўсё жыццё рабіў.

**28.02.1980 г.**

● Няма нацыі без пачуцця гістарызму, без спакойнага гонару за сябе і проста самапавагі, без веры ў тое, што яна ёсць яна, непераходзячая, сталая вечная каштоўнасць вечнага чалавецтва і па ўсіх гэтых прычынах павінна жыць, жыць дзейна і велічна, ведаючы сабе цану і ў дрэнным, і ў вялікім.

**24.09.1980 г.**

● Аптымізм беларускі ў тым, што калі мы, нягледзячы на ўвесь песімізм і безнадзейнасць мінулага, усё ж жывём, значыць, у нас ёсць падставы гаварыць аб лепшым будучым.

**17.02.1982 г.**

● Нястойкая няўдача лепей за нястойкую ўдачу.

**22.06.1982 г.**

● Прызнаю і ваюю ўсім жыццём за адзіную ў свеце нецярпімасць: нецярпімасць да нецярпімасці. Хай кожны думае па-свойму і ўчыняе па-свойму, калі гэта не шкодзіць суседу гэтаксама думаць і ўчыняць. Калі пра гэта забываюць — нецярпімасць нават пакрыўджаных ператвараецца ў пякельную пачварнасць. І вось паляць, крыўдзяць, забіваюць. Ахвяра робіцца катам, прыгнечаны — прыгнятальнікам. Толькі найшырэйшая цярпімасць — вядома, не да ізуверства, людаедства і чалавеканенавісніцтва — уратуе свет і не дасць яму загінуць. Хай вострацъ пёры і думкі ў спрэчках — абы не мачалі гэтыя пёры ў чужой крыві. Абы вастрыня думкі не пераходзіла ў падступную подласць і падтасоўванне. Нецярпімасць да нецярпімасці — адзінае, што павінна рухаць светам, калі мы прэтэндуем на правы звацца людзьмі.

**24.07.1982 г.**

● У брахуна павінна быць выключная памяць.

**1976 г.**

● Лепей за ўсё смяяцца з сябе. Ніхто не крыўдуе.

**1976 г.**

*(З нататнікаў)*

● Стома — смерць. Ідзі вышэй сілаў сваіх, і станеш жыць доўга.

**1964 г.**

● Дзеці — усмешка Божая.

**1964 г.**

*(Каласы пад сярпом тваім)*

● Нішто не знікае з таго, чаму нельга знікнуць.

**07.07.1963 г.**

● Галоўнае ўва ўсіх адно: любоў.

**13.01.1964 г.**

● Чалавек, які робіць крыўду другому, у рэшце рэшт крыўдзіць сябе.

**1984 г.**

*(Словы, сказаныя напярэдадні апошняга падарожжа (паводле ўспамінаў Валянціна Ждановіча).*

**Афарызмы выбраў і падрыхтаваў Зміцер ЦЕХАНОВІЧ.**

Дзённік бландзінкі



# КНІГА ПЕРШАЯ, КНІГА АПОШНЯЯ...

Днямі літаратуразнаўцы, гісторыкі і архівісты ўспаміналі Генадзя Кісялёва.

Некалі навукоўцы любоўна называлі яго «Генусам Кротусам Кісялёвым» — менавіта пад такім імем ён з'яўляецца ў знакамітым «Сказе пра Лысую гару»... Ён сапраўды глыбока капаў, даследуючы самыя загадкавыя месцы беларускай культуры. Кісялёў быў першым і адзіным айчынным навукоўцам, які працаваў у жанры «дэтэктыву без злачынства». Менавіта так напісана яго лепшая, на мой погляд, кніга «Жылі-былі класікі...», якая раскрывае таямніцу аўтарства самых вядомых ананімных паэм «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат».

Яго цікавасць да гэтых выбітных твораў беларускай культуры — рэдкі выпадак! — пачалася яшчэ са школы. У пасляваенным Віцебску кніжак было вобмаль. Рэдкія шчаслівчыкі мелі тоненькую брашурку з дзівоснымі радкамі пра прыгоды Энея і Тараса-палясоўшчыка — кніжачка выйшла ў год Перамогі, як адна з самых неабходных. З той пары радкі яе запалі ў душу, спарадзіўшы пасля цэлы цыкл літаратурна-даследчыцкіх дэтэктываў, якія не толькі адкрываюць цьмяныя старонкі беларускай гісторыі, але, перадусім, цікава і лёгка чытаюцца.




Пасля школы Генадзь Кісялёў вучыўся ў Маскве ў Гісторыка-архіўным інстытуце. Працаваў у Вільнюсе, дзе зацікавіўся паўстаннем 1863 года. Выпусціў дзве кнігі пра Кастуся Каліноўскага — «Сейбіты вечнага» і «З думай пра Беларусь». І напісаў, безумоўна, самую арыгінальную літаратуразнаўчую працу ў беларускай навуцы — даследаванне-дэтэктыў «Жылі-былі класікі: хто напісаў паэмы «Энеіда-навыварат» і «Тарас на парнасе». Як слушна заўважыў яго сябра і калега В. Чамярыцкі, Кісялёў зрабіў для Беларусі больш, чым самі беларусы...

Да гадавіны са дня смерці яго сям'я і сябры падрыхтавалі і выдалі кнігу, на вокладцы якой стаіць сумнае пазначэнне «Кніга першая... кніга апошняя».

# БІЧ

Збіраюся зайсці ў домакіраўніцтва і бачу непадалёк карцінку.

Валера, якога напэўна хоць раз у жыцці заўважаў кожны жыхар нашага горада, мяце асфальт каля жэсаўскага пад'езда. Задумалася — гэты чалавек ды за працай, нешта тут не тое...

Валера — асоба, якая зарабляе на жыццё кампліментамі. Ён падыходзіць да мінакоў, пажадана калі гэта мужчына з жанчынай, і пачынае лісліва камплiменціць. Калі яму адказваюць па-беларуску, ён пачынае чытаць вершы — кажуць, Валера некалі быў сябрам Саюза пісьменнікаў. Гэтым і зарабляе.

Нейкі час мне здавалася, што ён — адзіны беларускамоўны бомж. Але аднойчы пачула, як ён па-расійску сварыцца з грузчыкамі, прычым сварка скончылася Валеравым пафасным:

— Я не бомж, я — БІЧ!

Як Былы Інтэлігентны Чалавек, Валера грэбуе падпрацоўкамі.

Таму, калі я зайшла ў домакіраўніцтва, высветлілася, што ўсе яго супрацоўнікі каля акна вытрэшчваюць вочы на Валеру з мяцёлкай, спрабуючы разгадаць, што здарылася...

...таямніца раскрылася проста. Калі я выходзіла, Валера з сябрам усталявалі бутэльку гарэлкі і закусь на паверхню імправізаванага стала — ганка.

На адлегласці пяці метраў ад бутэлькі ўвесь асфальт быў вымецены да стэрыльнага стану.

# СМЕРЦЬ І РУШНІКАСУШЫЛЬНЯ

Мая знаёмая — урач правінцыйнай бальніцы.

У чацвер у іх бальніцы памерла маладая жанчына ад віруснай пнеўманіі. Яе дачка таксама хварэла. Прывезлі хваробу з Украіны, куды ездзілі на шопінг — мяжа рукой падаць. Горад маленькі, таму ўсе ў курсе.

У пятніцу ў кабінет да знаёмай убягае пацыентка, якая займаецца такім шопа-бізнэсам:

— Дайце мне гарантыю, што я не захварэю на свіны грып ва Украіне!

— Няхай вам Мінздраў Украіны дае такую гарантыю...

— Але мой участковы ўрач — вы!!!

— Як ваш участковы ўрач, раю ўстрымацца ад паездкі ў гэтую краіну ў найбліжэйшы час.

— А вы ведаеце, колькі каштуе сушылка рушнікоў у Беларусі? Трыста дваццаць тысяч! А ва Украіне — сто шэсцьдзясят! Вядома ж, усе паедуць!

І паехалі. Селі ў суботу ў аўтобус і паехалі. Хоць памежнікі і папярэджвалі, што назад могуць і не вярнуцца, бо чакаецца каранцін...

...некаторыя вымяраюць каштоўнасць свайго жыцця рушнікасушылкамі.

## РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ

**• о проведении аукциона по продаже имущества РУП «Витебский механический завод» с одновременной продажей права на заключение договора аренды земельных участков**

**Продавец: Ликвидационная комиссия РУП «Витебский механический завод».**

**ЛОТ № 1:** Здание гаража с участком цеха № 2, инв. № 200/С-51630, пл. 568 кв.м (фундамент – бетон; наруж. и внутр. капстены – кирпич; перегородки – кирпич, чердачные перекрытия – деревян., ж/б плиты; крыша – железо, совмещ. рулон.; полы – бетон; электроосвещение – скрытая проводка; отопление – центральное, водопровод – стальн. трубы, канализация – чугун. трубы), проезжая часть 148 кв.м, ограждение, сеть водопровода, теплотрасса, сеть фекальной канализации, электросеть, станок вертикально-сверлильный 2А 125, станок токарный 1А 62 с начальной ценой продажи 104 047 072 рубля с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,1718 га, срок аренды 10 лет, кадастровый № 240100000003004366 с начальной ценой продажи 16 302 930 рублей. Адрес местонахождения: г. Витебск, ул. Пороховая, 9 С. ИТОГО начальная цена лота: **120 350 002** рубля.

**ЛОТ № 2:** Здание заправочной, инв. № 200/С-51655, пл. 5,9 кв.м (фундамент – бетон; наруж. и внутр. капстены – кирпич; полы бетон; крыша – совмещенная), проезжая часть 53 кв.м, ограждение 251,9 кв.м, ворота въездные с начальной ценой продажи 13 407 320 рублей с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,0590 га, срок аренды 65 лет, кадастровый № 240100000003004368 с начальной ценой продажи 21 077 809 рублей. Адрес местонахождения: г. Витебск, ул. Пороховая, 9 Ю. ИТОГО начальная цена лота: **34 485 129** рублей.

**ЛОТ № 3:** Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 200/С-51637, пл. 93 кв.м (фундамент ж/б; наруж. и внутр. капстены – кирпич; перегородки – кирпич; пол – керам. плитка, бетон; крыша – совмещ. рулон; центральное отопление – чугун. радиаторы; электроосвещение – скрытая проводка; водопровод – стальные трубы; канализац. – чугун. трубы); здание «Помещение для охраны» инв. № 200/С-64570, пл. 5,8 кв.м (фундамент – металич. столбы; наруж. и внутр. капстены – металич. утеплены; полы – дощатые; крыша металлическая), проезжая часть 281 кв.м, ограждение 280,8 кв.м, сеть водопровода, кран подвесной г/п 2т с начальной ценой продажи 52 392 976 рублей с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,2163 га, срок аренды 33 года, кадастровый № 240100000003004356 с начальной ценой продажи 45 573 594 рубля. Адрес местонахождения: г. Витебск, ул. Пороховая, 9 Г. ИТОГО начальная цена лота: **97 966 570** рублей.

**ЛОТ № 4:** Вспомогательное здание, инв. № 200/С-51656 пл. 413 кв.м (фундамент – ж/б; наруж. внутр. капстены – кирпич; перегородки – кирпич; полы – керам. плитка, бетон; крыша – совмещ. рулон; центральное отопление – чугун. радиаторы; электроосвещение – скрытая проводка; водопровод – стальн. трубы, канализация – чугун. трубы), здание склада № 30 инв. № 200/С-66663 пл. 40,9 кв.м (фундамент – бетон; наруж. и внутр. капстены – кирпич; полы – бетон; крыша – совмещен.), проезжая часть 375 кв.м, сеть водопровода, теплотрасса, сеть фекальной канализации, сеть фекальной канализации для производственных нужд, электросеть, две мешалки гидравлические МГИ – 4 с начальной ценой продажи 119 099 305 рублей с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,0884 га, срок аренды 62 года, кадастровый № 240100000003004357. Адрес местонахождения: г. Витебск, ул. Пороховая, 9 Д. ИТОГО начальная цена лота: **149 364 398** рублей.

**Условие:** победитель возмещает расходы по изготовлению документации, необходимой для проведения аукциона, в размере 497 950 рублей по каждому лоту.

**Аукцион состоится 30 декабря 2009 года в 10.00** по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни до 17.00 по 29.12.2009 г. включительно по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

**• о проведении аукциона по продаже имущества РПУП «Витебский меховой комбинат» с одновременной продажей права на заключение договора аренды земельных участков**

**Продавец: РПУП «Витебский меховой комбинат».**

**ЛОТ № 1:** здание ремонтно-механического цеха, инв. № 200/С-62831; пл. 986 кв.м (фундамент – бетон; стены и перегородки – кирпич, ж/б панели; перекрытия – ж/б плиты; крыша – рулонная; полы – бетон, плитка; проемы дверные, оконные – простой работы; внутренняя отделка – простая штукатурка, покраска, побелка, облицовка плиткой; отопление – центральное; электроосвещение – скрытая, открытая проводка; водопровод – стальные трубы; канализация – чугунные трубы; горячее водоснабжение – стальные трубы; вентиляция – вентканалы) и иное имущество с начальной ценой продажи 442 449 260 рублей с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,2655 га, кадастровый № 240100000003005160, срок аренды 49 лет с начальной ценой продажи 77 846 218 рублей. ИТОГО начальная цена лота: **520 295 478** рублей.

**ЛОТ № 2:** здание «павильон Смоленск», инв. № 200/С-64851, пл. 82 кв. м (фундамент – бетон; наруж. и внутр. стены – металлические; перегородки – дощатые; крыша – метал.; полы – линолеум; проемы дверные, оконные – простой работы; отопление – печное; электроосвещение – открытая проводка) с начальной ценой продажи 21 699 020 рублей с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,0121 га, кадастровый № 240100000003005147, срок аренды 19 лет с начальной ценой продажи 1 716 297 рублей. ИТОГО начальная цена лота: **23 415 317** рублей.

**ЛОТ № 3:** здание склада, инв. № 200/С-63444, пл. 2146,4 кв. м (фундамент – бетон; стены – ж/б; перегородки – силикатные блоки; крыша – металлич.; полы – асф/б; проемы оконные – простой работы; проемы дверные – ворота металлические) с начальной ценой продажи 417 316 440 рублей с учетом НДС; право аренды земельного участка пл. 0,3304 га, кадастровый № 240100000003005161, срок аренды 23 года с начальной ценой продажи 53 470 128 рублей. ИТОГО начальная цена лота: **470 786 568** рублей.

**ЛОТ № 4:** изолированное нежилое помещение, инв. № 200/D-112596, пл. 121,7 кв. м (наруж. и внутр. стены – кирпич., ж/б; перегородки – кирпич; перекрытия – ж/б; полы – плитка, линолеум; проемы оконные – двойные створные; проемы дверные – простой работы; отопление – центральное; электроосвещение – скрытая проводка; водопровод – стальн. трубы; канализация – чугун. трубы; горячее водоснабжение – стальн. трубы). Начальная цена продажи: **77 762 000** рублей с учетом НДС.

Имущество расположено по адресу: г. Витебск, ул. 2-я Прибережная, 1

**Условие:** победитель возмещает расходы по изготовлению документации, необходимой для проведения аукциона: по ЛОТу № 1 – 1 781 228 руб.; по ЛОТу № 2 – 1 358 872 руб.; по ЛОТу № 3 – 1 310 334 руб.

**Аукцион состоится 30 декабря 2009 года в 15.00** по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни до 17.00 по 29.12.2009 г. включительно по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников с 14.30 до 15.00 по месту проведения аукциона.

**1.** Аукцион проводится в порядке, установленном действующим законодательством.

**2.** Для участия в аукционе приглашаются юр. и физ. лица. Участнику необходимо подать заявление с приложением следующих документов: заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % стоимости лота; юр. лицом РБ или индивидуальным предпринимателем – копии учредительных документов и свидетельства о госрегистрации; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка подготовлена в течение 6 мес. до подачи заявления на участие) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**3.** Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебск, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

**4.** Победитель возмещает фактические затраты по организации и проведению аукциона, которые сообщаются участникам до начала аукциона.

**5.** Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с Продавцом, не позднее 20 рабочих дней после проведения аукциона. Платежи за объект осуществляются согласно договору купли-продажи объекта.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: **8 (0212) 43 54 35; 43 54 95; 8 (029) 591 00 02; эл.почта: Vit.in@tut.by; www.Ocenka.by.**

